БРЭСЦКІ ГАРАДСКІ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

вул. Энгельса, 3, 224005, г.Брэст, 5
тэл. (8-0162) 30 18 01
e-mail: ispolcom@city-brest.gov.by
р/р BY55AKBB36040000025681000000
ААТ «ААБ Беларусбанк»
УНП 200020300, БІК AKBBBY2X

БРЕСТСКИЙ ГОРОДСКОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

ул. Энгельса, 3, 224005, г.Брест, 5
тел. (8-0162) 30 18 01
e-mail: ispolcom@city-brest.gov.by
р/с BY55AKBB36040000025681000000
ОАО «АСБ Беларусбанк»
УНП 200020300, БИК AKBBBY2X

03.06.2026 № 35-1/204/12

На № ________________ ад ________________

[redacted]

Паважаны Уладзімір Аляксандравіч!

Брэсцкі гарадскі выканаўчы камітэт, разгледзеўшы Ваш зварот паведамляе наступнае.

Паводе артыкулу 13 і 29 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» на транснарце, у гандлі, у сферы медыцынскага і бытавога абслугоўвання ўжываецца беларуская або руская мова, а пры неабходнасці – іншыя мовы, а тэксты афіцыйных аб'яў, паведамленняў, плакатаў, афіш і іншай інфармацыі выконваюцца на беларускай і (або) рускай мовах.

У г. Брэсце назвы прыпынкаў, а таксама расклад руху грамадскага транспарту выкананы на беларускай мове.

У сувязі з тэхнічнымі абмежаваннямі існуючага парку літарных інфарматараў (адсутнасць падтрымкі спецыфічных сімвалаў беларускага алфавіту ў апаратуры і праграмным забеспячэнні), карэктнае адлюстраванне назваў на беларускай мове (напрыклад словы «паўднёвы») тэхнічна немагчыма.

Каб інфармацыя на табло была чытэльнай і карэктнай, прынята рашэнне выкарыстоўваць рускую мову, што не супярэчыць дзеючаму заканадаўству і накіравана на зручнасць пасажыраў.

Адначасова гукавое інфармаванне ў грамадскім транспарце адбываецца на беларускай мове.

У выпадку нязгоды з дадзеным адказам Вы маеце права абскардзіць яго у адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь № 300-З ад 18 ліпеня 2011 г. «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» у Брэсцкі аблвыканкам (г. Брэст, вул. Леніна, 11).

Першы намеснік
старшыні гарвыканкама

Ю.В.Клімаховіч

09 Ківаў 30 18 39